

**Іван Пятровіч Шамякін** — народны пісьменнік Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, акадэмік НАН Беларусі, нарадзіўся 30 студзеня 1921 года ў вёсцы Карма Добрушскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

З 1925 года бацька стаў працаваць лесніком, канчаткова страціўшы надзею разжыцца на ўласнай зямлі. У сувязі з гэтым месца жыхарства часта мянялася: Цярэшкавічы пад Нова-Беліцай, Новая Стража пад Краўцоўкай. Жыццё ў леснічоўках (іх у той мясцовасці называлі "стражамі") не толькі вельмі рана прывучвала да самастойнасці, да працы, да захаплення роднай прыродай, але і дазваляла адчуць складанасць усяго, што адбывалася.

Скончыў пачатковую школу ў вёсцы Краўцоўка, потым мяняў школы (з-за пераезду сям'і); у пятым і шостым класе вучыўся ў Кармянскай школе, затым закончыў Макаўскую сямігодку.

Пасля заканчэння сямігодкі ў 1940 годзе паступіў вучыцца ў Гомельскі тэхнікум будаўнічых матэрыялаў. У студэнцкія гады пачаў пісаць спачатку паэтычныя, а затым і празаічныя творы, стаў членам літаратурнага аб'яднання пры абласной газеце "Гомельская праўда", пазнаёміўся з паэтамі Л. Гаўрылавым, К. Кірэенкам, Дз. Кавалёвым.

Сябры па літаб'яднанню ўхвалілі яго прозу, але не прынялі паэзію. Гэта паўплывала на выбар маладога аўтара: у 1940 годзе даслаў свае першыя апавяданні ў рэдакцыю "Полымя рэвалюцыі", рэдактарам якога быў Міхась Лынькоў. Іван Шамякін быў уражаны тым, што Лынькоў пісаў яму пісьмы-рэцэнзіі на 4—6 старонках машынапісу і дэталёва разбіраў апавяданні маладога пісьменніка, вучыў, "як трэба і як не трэба" пісаць.

Пасля заканчэння тэхнікума Іван Шамякін быў накіраваны ў Беласток, дзе стаў працаваць тэхнікам прамкамбіната, але хутка быў прызваны ў армію, служыў у зенітна-артылерыйскай часці, якая стаяла

ў Мурманску. Калі пачалася вайна, абараняў Мурманск і іншыя гарады ад варожых самалётаў. У апошні год вайны яго вайсковую часць перакінулі ў Польшчу. Перамогу сустрэў на Одэры, дзе служыў яшчэ да восені. Увесь ваенны час прадаўжаў пісаць.

У канцы 1945 года ў часопісе "Полымя" была надрукавана аповесць "Помста", якая лічыцца пачаткам літаратурнай дзейнасці.

Пасля дэмабілізацыі жыў з сям'ёй у вёсцы Пракопаўка на Гомельшчыне, дзе працаваў настаўнікам. Стаў вучыцца на завочным аддзяленні Гомельскага педінстытута, спалучаў працу ў школе з абавязкамі сакратара мясцовай партарганізацыі, увесь вольны час аддаваў літаратуры.

Быў запрошаны на першы пасляваенны пленум Саюза пісьменнікаў Беларусі, што адыграла значную ролю ў жыцці Шамякіна: ён пазнаёміўся з многімі пісьменнікамі, акунуўся ў праблемы літаратуры.

У гэты час пісьменнік працуе над раманам "Глыбокая плынь", які стаў адным з першых твораў у беларускай літаратуры, прысвечаных партызанскай барацьбе. У 1949 годзе раман "Глыбокая плынь" і празаічны зборнік "На знаёмых шляхах" , у які ўвайшлі апавяданні і аповесць "Помста", былі выдадзены.

У 1948 годзе Іван Шамякін паступіў у Рэспубліканскую партыйную школу і пераехаў у Мінск. Пасля заканчэння партшколы быў рэдактарам альманаха "Советская Отчизна", а ў 1954 годзе быў выбраны намеснікам старшыні Саюза пісьменнікаў рэспублікі. Доўгія гады ён будзе працаваць ў апараце Саюза пісьменнікаў на розных пасадах. У 80-я гады быў галоўным рэдактарам выдавецтва "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя". Пісьменнік займаў шэраг адказных дзяржаўных пасад. Ён выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР і СССР, працяглы час быў Старшынёй Вярхоўнага Савета БССР.

У 1972 годзе яму было прысвоена ганаровае званне народнага пісьменніка, але не пасады і званні былі для яго галоўным. На першым месцы заўсёды была творчая праца.

Што больш за ўсё ўражвае ў біяграфіі І. Шамякіна? Безумоўна, яго незвычайная працаздольнасць. Вымушаны, як і ўсе сялянскія дзеці, працаваць з маленства, ён і ў творчай працы быў нястомным. Раманы, аповесці, апавяданні, артыкулы, рэцэнзіі, выступленні на літаратурных форумах і сустрэчах з чытачамі, на рознага роду пасяджэннях — усё гэта патрабавала напружанай, нястомнай працы. З дзяцінства ён пазнаў, чым з'яўляецца для чалавека добрая кніга, зведаў яе ўздзеянне на душу і розум, таму вельмі хацеў, каб і яго творы сталі для чытачоў вернымі сябрамі, шчырымі дарадцамі і настаўнікамі, вучылі іх "быць чалавекам". Іменна гэтыя словы вызначаюць асноўны матыў творчасці пісьменніка, і яго кнігі сапраўды сталі любімымі для многіх чытачоў.

## Мнение читателя:




У аснове **рамана «Вазьму твой боль»** ляжыць надзвычай складанае пытанне: ці ёсць апраўданне злу? Былы паліцай Шышковіч па мянушцы Шышка вяртаецца ў сваю вёску, дзе ў час вайны пакінуў крывавыя сляды. Мінула трыццаць пяць гадоў, але не можа забыць Іван Батрак, калгасны механізатар, як Шышка распраўляўся з іхняй партызанскай сям'ёй. Ён, тады яшчэ дзіця, цудам ацалеў. Вось як герой твора згадвае тыя жудасныя хвіліны: «Але быў... быў адзін сведка, калі сям'ю нашу знішчажалі. Я! Я пад печчу сядзеў... І ён... Шышка шукаў мяне там... аўтаматнымі чэргамі. Чэргамі! Калі б матка лаза таго не зрабіла...» Загінулі ад рук паліцая цяжарная маці і маленькая Іванава сястрычка.

Пісьменнік завастрае ў творы праблему памяці, праблему чалавечай душы, скалечанай вайной. «Ён жа забіваў дзяцей! Людзі! Няўжо вы не знаеце? Ці забыліся?» — такім пранізлівым болем заходзіцца Іванава душа, у якой успыхвае нянавісць, узнікае жаданне адпомсціць забойцу родных яму людзей.

Іван Батрак і маральна і псіхалагічна не можа дыхаць адным паветрам з Шышковічам, адчувае, што ніколі не даруе яму ўчыненага злачынства. Былы паліцай сустрэў смерць ад Іванавай жонкі Таісы, якая, здзейсніўшы такі сурова-жорсткі ўчынак, забрала боль блізкага чалавека. Хоць Таіса ведае: ёй трэба будзе адказваць...

Іван Шамякін сваім раманам сцвярджае, што памяць — адказная і цяжкая ноша душы.

*Кароль Алена Мікалаеўна*